2 Letter from Prince Albert to Queen Victoria, dated 15 November 1839 [Электронный ресурс] // Queen Victorias scrapbook. – 2012. – Режим доступа: http://www.queen-victorias-scrapbook.org. – Дата доступа: 02.05.2016.

3 Queen Victoria records her wedding to Prince Albert in her Journal entry of 10 February 1840 [Электронный ресурс] // Queen Victorias scrapbook. – 2012. – Режим доступа: http://www.queen-victorias-scrapbook.org. – Дата доступа: 02.05.2016.

4 Хибберт, К. Королева Виктория / К. Хибберт. – М.: АСТ, 2008. – 736 с.

**УДК 7.091.4:316.7(476)**

***В. А. Пранабіс***

## ФЕСТЫВАЛІ ТРАДЫЦЫЙНЫХ КУЛЬТУР У СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСІ

*Артыкул распавядае аб найбольш маштабных і вядомых фестывалях традыцыйнай культуры на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. У ім дадзена адзнака сістэме іх правядзення і арганізацыі, прыведзены пералік і анаіз асноўных мерапрыемстваў іх праграм. У ходзе даследвання зроблены вывад аб вялікай значнасці разглядаемых фэстаў у справе захавання традыцый народных культур, развіцця міжкультурнага дыялога і турызма.*

На сучасным этапе вельмі актуальным з’яўляецца захаванне традыцыйнай культуры розных народаў, якая адчувае ўсё большае ўздзеянне масавых стандартаў. Найбольш эфектыўны спосаб здзяйснення гэтай мэты: правядзенне культурна-масавых мерапрыемстваў заснаваных на захаванні народных традыцый. У якасці якіх на Беларусі выступаюць фестывалі нацыянальных культур.

Мэтай даследвання стала вывучэнне фестываляў традыцыйных культур у сучаснай культурнай практыцы Рэспублікі Беларусь. Для вывучэння былі абраны найбольш значныя, ў культурнам плане, фестывалі сістэма арганізацыі якіх знаходзіцца на высокім прафесійным узроўні.

Розныя аспекты фестывальнага жыцця Беларусі на матэрыялах канкрэтных мерапрыемстваў пакуль дастаткова не распрацаваны. Большая частка інфармацыі па тэме знаходзіцца ў энцыклапедычных выданнях турыстычнай і этнакультурнай тэматыкі, а таксама матэрыялах перыядычнага друку, фотафактах і інтэрнэтрэсурсах.

У Беларусі добра наладжаны працэс захавання традыцыйнай культуры, сведкай гэтаму выступае вялікая колькасць фестывальных праграм этнаграфічнай тэматыкі, якія адбываюцца па ўсёй краіне. Асабліва цікавай падзеяй гэтага накірунку з’яўляецца «Республиканский фестиваль национальных культур», які праходзіць раз у два гады, ў горадзе Гродна.

Фестываль заўсёды пачынаецца ўлетку, звычайна ў чэрвені месяцы. Адкрыццё яго адзначаецца святочным шэсцем прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей у традыцыйных касцюмах, па галоўных вуліцах горада. Пасля чаго, на плошчы, пачынаецца канцэрт артыстаў ад розных нацыянальных дыяспар, які цікавіць не толькі мясцовых жыхароў, але і гасцей горада. Толькі на наступны дзень пачынаюць працу шматлікія нацыянальныя падвор’і. Тут усе жадаючыя, маюць магчымасць пазнаёміцца з разнастайнымі стравамі нацыянальнай кухні і прыкладамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, бліжэй разглядзець традыцыйныя касцюмы, убачыць народныя танцы. Некаторыя з падвор’яў праводзяць майстар-класы. Пад час фестывалю ў горадзе адбываюцца таксама свята-конкуры нацыянальнага харэаграфічнага мастацтва, гала-канцэрты калектываў нацыянальных аб’яднанняў, шоў-прэзентацыі і шматлікія выставы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Фестываль з’яўляецца яскравым прыкладам яднання розных культур, у рамках адзінай культурнай прасторы, адкрываючы новыя магчымасці для міжнацыянальнага дыялога і супрацоўніцтва.

Самым папулярным фестывалем, на якім прадстаўлена традыцыйная беларуская культура і культура народаў блізкага замежжа, з’яўляецца «Славянскі базар» у Віцебску. Гісторыя гэтага праслаўленага фэсту пачынаецца з 1992 года. Галоўнай мэтай, пад час яго стварэння, стала аб’яднанне блізкароднасных славянскіх культур і народаў, а таксама падтрымка культурных сувязей краін былога СССР.

У рамках фестывалю праходзяць шматлікія выставы-продажы сувенірнай прадукцыі і разнастайныя святочныя дзеянні, якія арганізуюцца непасрэдна на вуліцах горада.

Так у 2015 годзе цікавасцю гасцей горада карысталася выстава-ярмарка народных рамёстваў і мастацтваў «Задзвінскі кірмаш». У яе рамках былі праведзены: свята мастацкай апрацоўкі дрэва, свята ганчарнага рамяства, майстар-клас кавальскага майстэрства. Былі арганізаваны асобныя выставы беларускай традыцыйнай культуры і краін блізкага замежжа, ў форме падвор’яў. Па этнаграфічным матывам было праведзена некалькі тэатралізаваных свят. Адметнай падзеяй фестывалю ў мінулым годзе стала выстава «Чароўны свет цацкі» і свята беларускага рушніка «Рушнік, як лёс».

Штогод арганізатары фестывалю ладзяць у горадзе так званы «Горад майстроў». Тут выстаўляюць свае работы лепшыя майстры народнай творчасці Беларусі, Украіны, Расіі, Латвіі і Літвы. На розных выставах і пляцоўках фестывалю, таксама штогод, арганізуецца дэгустацыя страў і напояў нацыянальнай беларускай кухні.

Падагульняючы вышэйсказанае, магчыма зрабіць выснову, што «Славянскі базар», гэта самае папулярнае ўрачыстае дзеянне, з этнаграфічным зместам на Бларусі. Якое не толькі паляпшае культурны ўзровень нацыі, а і садзейнічае развіццю турызму ў Беларусі.

Знакавым для культуры краіны з’яўляецца свята «Браславские зарницы». Гэта адзін з фестываляў доўгажыхароў, афіцыйная дата яго адкрыцця 1967 год.

Штогод у Браслаў з’язджаюцца прадстаўнікі розных нацыянальнасцей (літоўцы, эстонцы, украінцы, рускія, палякі і інш.) для дэманстрацыі сваёй матэрыяльнай і духоўнай спадчыны. Цэнтральнае месца на фестывалі займае беларуская традыцыйная культура.

Адным з галоўных мерапрыемстваў свята, выступае шэсце ўдзельнікаў фестывалю. Цікавасцю наведвальнікаў карыстаюцца так званыя нацыянальныя падвор’і і невялікія сувенірныя кірмашы, майстар-класы. Цэнтральным момантам свята з’яўляюцца выступленні беларускіх фальклорных ансамбляў, і спаборніцтвы ў традыцыйных беларускіх танцах.

Свята традыцыйнай культуры «Браславские зарницы», мае не вельмі высокія паказчыкі па наведванні замежнымі турыстамі, і пакуль не ў поўнай меры ўведзена ў турыстычнае выкарыстанне. Але адыгрывае вялікую ролю ў захаванні культурнай спадчыны розных народаў.

Адной з самых вядомых этнатурыстычных падзей Гомельскай вобласці з’яўляецца міжнародны фестываль этнакультурных традыцый «Зов Полесья», які адбываецца штогод у Петрыкаўскім раёне .

Прыпяцкае Палессе да нашых дзён захавала ў надзвычай багатым выглядзе рысы самабытнай культуры палешукоў. Таму галоўнай мэтай фестывалю з’яўляецца захаванне і папулярызацыя этнакультурных традыцый Палесскага рэгіёна, а таксама ўмацаванне творчых сувязей беларускай культуры з культурамі іншых народаў. З 2010 года фестываль мае міжнародны статус і прымае гасцей з блізкага замежжа.

Адметнасцю з’яўляецца наданне вялікай увагі захаванню традыцыйнай духоўнай культуры. Таму ў рамках мерапрыемства арганізуюцца канцэртныя выступленні беларускіх, рускіх і украінскіх фальклорных калектываў. Яшчэ адной асаблівасцю з’яўляецца правядзенне свята беларускага рушніка і арганізацыя харчовай ярмаркі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У рамках фестывалю прадстаўлены традыцыйныя беларускія рамёствы, менавіта характэрныя для Прыпяцкага Палесся.

Кожны год гэту культурную падзею наведваюць тысячы чалавек, што спрыяе агульнаму развіццю турызму ў рэгіёне і папулярызацыі традыцыйных куьтур.

Вельмі папулярнай праявай культурнага жыцця з'яўляецца Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня», што праходзіць раз у 2 гады ў г.п. Акцябрскі. Захаваць народныя традыцыі, паказаць іх унікальнасць, не толькі для беларускай, але і сусветнай культуры – прызначэнне і місія «Берагіні».

Афіцыйнае адкрыццё фестывалю пачынаецца святочнымі канцэртамі і прэзентацыямі. Пасля адкрыцця фэсту, на працягу трох дзён, адбываецца правядзенне конкурсных спаборніцтваў і турніраў паміж удзельнікамі. Турнір дзіцячых і маладзёжных фальклорных калектываў, уключае наступныя праграмы: харэаграфічнае мастацтва, музычнае мастацтва, народная проза, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Адбываецца Рэспубліканскі турнір салістаў – выканаўцаў народных твораў [1, с. 30].

Акрамя гэтага, падчас фестывалю праводзяцца конкурсы на лепшае падвор'е, кірмашы народных умельцаў і разнастайныя майстар-класы: лозапляценне, пляценне паясоў, лепка з гліны і г. д.. Падчас правядзення конкурсных праграм праходзяць выступленні фальклорных ансамбляў.

Асаблівасцю фэсту з'яўляецца правядзенне ў яго межах рэканструкцыі традыцыйнага беларускага Купалля.

Такім чынам, фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня» з'яўляецца захаваннем і трансляцыяй традыцыйных культурных здабыткаў.

Яшчэ адным этнаграфічным мерапрыемствам, менавіта музычна-песеннай накіраванасці, з'яўляецца міжнародны фестываль народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік». Які штогод праходзіць летам у Паставах Віцебскай вобласці.

Праграма фестывалю ўключае ўрачыстае адкрыццё, прэс-канферэнцыю і афіцыйную сустрэчу ўдзельнікаў, іх ўрачыстае шэсце, конкурс творчых калектываў і выканаўцаў на народных музычных інструментах «Хто каго?», выставы народных мастацкіх рамёстваў і промыслаў. Апошнія праходзяць у форме невялікіх кірмашоў і прадвор'яў, з арганізацыяй на іх тэрыторыі майстар-класаў. Адбываецца дэгустацыя страў нацыянальнай кухні краін удзельніц.

Цэнтральнае месца ў праграме фестывалю займае конкурс выканаўцаў на народных музычных інструментах «Хто каго?», на які з'язджаюцца прадстаўнікі розных культур і нацыянальнасцяў, з блізкага і далёкага замежжа. Акрамя мерапрыемстваў этнаграфічнай накіраванасці на фестывалі праходзяць тэатралізаваныя прадстаўленні, фаершоў, канцэрты зорак беларускай эстрады, што прыцягвае значную колькасць наведвальнікаў.

Міжнародны фестываль песні і музыкі «Дняпроўскія галасы ў Дуброўне», таксама з'яўляецца знакавай падзеяй у культурным і мастацкім жыцці Беларусі.

Ужо некалькі год запар гасцей фестывалю на мяжы Орша – Дуброўна з хлебам-солю і тэатралізаваным прадстаўленнем сустракаюць удзельнікі мастацкай самадзейнасці ўстаноў культуры раёна. Потым праходзіць частаванне гасцей. Калектывы-ўдзельнікі запрашаюцца ў Кіраёўскі гай, на сяброўскую сустрэчу, ўдзельнікаў фестывалю з-за мяжы. Штогод выстаўляюць напродаж свае вырабы ўдзельнікі народнага клуба майстроў «Дубрава». Упершыню у 2014 годзе ў рамках фестывалю прайшоў пленэр разьбы па дрэве «Майстры салаўінага краю». У праграму фестываля традыцыйна ўключаюцца канцэрты мясцовых фальклорных калектываў.

Фестываль спрыяе развіццю культуры і мастацтва розных народаў і адраджэнню народнай творчасці.

Адным з самых вядомых святаў нацыянальных культур з'яўляецца міжнародны фестываль *«Александрыя збірае сяброў». Гэты летні фэст, мае не такую багатую гісторыю, але дзякуючы сваёй разнабаковай добрараспрацаванай праграме, удалай рэкламнай палітыцы, ён стаў самай маштабнай падзеяй лета ў Магілёўскім рэгіёне.*

Репозиторий ГГУ имени Ф. Скорины

*Асноўныя мерапрыемствы этнаграфічнага зместу пачынаюцца ўжо ў першы дзень фэсту. Перш за ўсё гэта ярмаркі-выставы*. На іх прадстаўлены вырабы мелкай пластыкі народных майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі і іншых краін удзельніц, а таксама выстава-продаж тэматычнай сувенірнай прадукцыі. Асобна працуюць выстваčныя пляцоўкі «Свята хлеба» і «Свята кваса». У мінулым годзе, таксама, было праведзена некалькі тэатральзаваных народных свят і забаў. Цікавымі для наведвальнікаў штогод з’яўляюцца арганізаваныя майстар-класы па традыцыйным рамёствам, а таксама абласны конкурс па дэкаратыўна-прыкладному мастацтву «Золотой мастер». Заканчваецца першы дзень свята канцэртнай праграмай. Усе выставы, кірмашы і майстар-класы, працягваюць сваю дзейнасць пад час фестывалю.

Разгледжаны фэст з’яўляецца адным з лепшых прыкладаў папулярызацыі традыцыйнай культуры. Дзякуючы додрай маркетынгавай і фінансавай палітыцы, ён мае магчымасць пашырэння колу наведвальнікаў.

Цікавым, для наведвання турыстамі, можа выступіць свята нацыянальнай культуры «Вераснёвая палітра», якое штогод ладзіцца ў горадзе Наваполацку Віцебскай вобласці. Арганізатары прапануюць наведвальнікам мерапрыемства цікавую праграму, якая ўключае выступленне фальклорных калектываў раёну з танцавальнай і песеннай праграмай. Правядзенне майстар-класаў па беларускім традыцыйным танцам. Ладзяцца рамесныя пляцоўкі, дзе госці свята могуць паназіраць за працай народных майтроў. Для пар, якія заключаюць шлюб у гэты дзень, арганізатары прапануюць спецыяльную святочную праграму, з этнаграфічнымі элементамі. Падзеяй на фэсце становіцца рэканструкцыя традыцыйнага каляндарна-абрадавага свята беларусаў «Багач».

На сучасны момант, гэта амаль адзіны фэст традыцыйнай культуры, у нашай краіне, які адбываецца ўвосень і прымеркаваны да свята ўраджаю, у чым складаецца яго ўнікальнасць.

Падагульняючы вышэйсказанае неабходна зрабіць выснову, што на тэрыторыі Беларусі існуе значная колькасць фестываляў традыцыйных культур. Якія выконваюць не толькі рэкрыяцыйную функцыю і функцыю арганізацыі вольнага часу, але і садзейнічаюць захаванню і трансляцыі традыцыйных формаў культуры Беларусі, а таксама служаць падставай для развіцця на іх базе этнаграфічнага турызму.

**Літаратура**

1 Козенка, М. А. Берагіня: Восьмы рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва / М. А. Козенка. – Мінск: Чатыры чвэрці, 2014. – 30 с.

**УДК 904:62 (476.2):069.5 (476.2)**

***А. А. Радовская***

## КОЛЛЕКЦИИ РАДИМИЧСКИХ ДРЕВНОСТЕЙ В МУЗЕЙНЫХ СОБРАНИЯХ ГОМЕЛЬЩИНЫ

*Статья посвящена рассмотрению радимичских древностей, которые хранятся в музеях Гомельщины. В публикации показаны основные этапы формирования археологических коллекций, раскрыто значение музейных собраний для освещения истории материальной и духовной культуры населения Гомельского Поднепровья эпохи Древней Руси. Отмечается, что самая обширная и значимая коллекция радимичских древностей находится на хранении в Гомельском дворцово-парковом ансамбле.*

Коллекции радимичских древностей играют важную роль в экспозиционной и культурно-просветительской деятельности музейных учреждений Гомельщины. Предметы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ